Беларускі Шлях

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: [С]ерпухоуская вул. д. № 12

[Р]эдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
[А]дміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
[Р]эдакцыя пакідае за сабой права па[п]раўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Міеску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 59. Менск. Серада 5 чэрвеня 1918 г. Год I

Абвесткі.

Можа быць на далей адчынена што дня сталоука «Рэрацыя Неаполь». Гаспадар: Майсей Наман.

Нямецкі Градоначальнік.

Захароуская, № 160 у Гірша Шапіро адчынілася но[в]ая мясная крама.

Нямецкі Градоначальнік

Менск 5/6.

[С]траты, панесеныя Бела[ру]сью у гэтай вайне, шмат [пер]авышаюць страты другіх [кра]еу бышай Расійскай імпэ[рыі], пасожаных ні на пляцу [ба]ішых нямецка-рускіх баеу і [н]ат болей чым нікаторыя [мясц]ьці Францыі, якія знайхо[дзі]цца над боямі.

[Р]азам з усімі падобнымі [краі]ямі яна дазнала поунай га[спа]дарскай руіны, вывозіліся [ц]уміліся на станцыях расій[скі]х чугунак яе хвабрыкі і [заво]ды, загінулі, рэквізаваліся [для] ваеных патрэбау запасы [сыр]ых матэр'ялау. Гая пра[мыс]ловасьць, якая прывівалася [над]ака дзесяткамі гадоу і з вя[лікі]м трудом, калі дабаука но[вага] лішняго станка у хваб[рык]э, была маючай амаль ні [мал]ае значэнне, цяпер ні па[кін]ула па сабе нават і сьледу, [бо] усе што іпчэ аставалося [да] шчэнту было вывезено ад[туль] усякімі а в т о, адро і [ўся]імі «запамі» у Вялікаро[сію].

[Д]робнаму рамесьнічнаму про[мыс]лу які шырока істнавау [у] Беларусі вайной зроблены [с]прауны можа удар. Ты[сячы] дробных варстацікау [з]акрываліся, гаспадары іх [раз]сбіданы па усяму твару [бы]л. імпэрыі, а інструмэнты [за]пталіся у попелі ваеннай [пажа]жы.

[С]ельская гаспадарка знай[дз]іцца у такім стане, што [цяж]на гаварыць аб яе значэн[ні]. Зруйнованы сотні двароу і [ф]варкоу, сотні весак. Вы[бр]аны запасы насення, а [т]што пазаставалося, далека [л]епшаго гатунку, бо вайна [ун]аждівіла правідловую агро[на]мічную работу, пачаткі якой [ужо] у нас былі, а з ей і сор[тыр]уку і добрую ачыстку се[мян].

[В]ывела павыбірана рэквізы-цыямі, станцыі племяннной жывелы а зімі і тыя зачаткі лепшых пара—коні, кароу, авечак свіней якія ужо заводзіліся як у селянскай так і у дворскай гаспадарцы загінулі.

Страты культурнаго мення у гатунку школау нізшых і сярэдніх і спэцыяльных, якімі перад вайной досыць добра ужо пачала абзавадзіцца Беларусь, усякіх архівау, урадовых і прыватных, усякіх установау—ні пералічаны. На мільены рублеу.

Але усе гэтыя страты маюць больш-менш агульны характэр. На іх паскардзіцца могуць усе краі дакранутыя вайной.

Усе гэта было рэзультатам прыватнай і агульна-грамадзкай працы і працай можа быць вернуто, калі толькі як сьлед далажыць сваіх сілау да адбудовы краю.

Есьць апрача іх іпчэ адна страта магчымая толькі для Беларусі і такая, што найзаузятай працай яе у кароткі час ні направіш і ні вернеш. Гэта —страта лясоу.

Грунтам гаспадаркі для Беларусі было канечна земляробство. Аднак ні тая ступень сельска-гаспадарскай культуры і грамадзкай арганізацыі на якой нас трымала «мацъ»—Расія, была прычынай што сваім хлебам мы ледзьве што, так-сяк, карміліся.

А грошы і патрэбныя краю прадукты іплі у край за вывожаны у унутрапую Расію, на Украіну і за граніцу лес.

Прауда і выкарыстанне краеваго ляснога багацця рабілося надта кепска, ні па гаспадарску. Вывоз лясных матэр'ялау дау-бы у двае болей даходу каб яго лепі наставіць і разам с тым ні агалачау бы край ад запасу лясоу, але на ім да часу апіралося нашэ гаспадарскае значэнне.

І пасьля вайны надоуга іпчэ пакуль удасца працай направіць усе ваенныя шкоды і наставіць на выжэйшы ступень нашы земляробство, лесы будуць глаунаю асновай нашай краевай гаспадаркі.

А з імі вайна абыйшлася надта нямілась[ц]іво. Акопы бліндажы, баракі, дарогі і проста артылерыйскі агонь жэрлі нашыя дрэвы ні шкадуючы ні думаючы аб тым што з гэтаго будзе далей. Подлуг з гэтым усякія «ваенныя» дастаушчыкі дзесяткамі тысяч бярвенняу у штуках і пілаваным матэр'яле карыстаючы з асобных льготных правоу высылалі наш лес у Расію і на Украіну.

Рэволюцыя дадала імпэту гэтай справе нішчэння. З аднаго боку падрадчыкі сьпяшылі выкарыстаць з астаткау сваіх прывілеяу на глум народнаго мення і памешчыкі, катория ні было ужо чаго губляць, з другога боку селяне, каторым адразу адчыніуся доступ да забароненаго мейсца, старaліся як мага. Добры будоуляны лес высекауся на дровы, секся проста с пня абы-б ні дастауся ні «вашым ні нашым» і аставауся гніць намейсцу.

На жаль мы чуем, што і цяпер нават ідзець тое-ж глумленне, Гэтаму прычынай той ніпэуны прауны стан у якім знаходзіцца Беларусь. Законамі расійскаго ураду, якія цяпер ні маюць тутака абавязковай сілы прыватная земская уласнасьць скасована. Першая устауная грамата Рады нібы падцвярдзіла іх, але нічога пэунаго, нічога выразнаго у кірунку аграрнаго законодаўства німа і пэуна ні будзе да склікання Установчаго Беларускаго Сойму.

І да гэтаго часу усе хто па праудзі есьць грамадзянін краю, павінны—былі-б устрымацца ад прычынення яму шкоды.

Добра арганізованая улада разумеецца і ні дапусьціла-бы рабіць гэто. Але краевая Беларуская Улада да гэтых час іпчэ знайходзіцца на стопені арганізацыі і дапамагчы краевай бядзе дауно ужо павінна была-б узяцца прыватная ініцыятива.

Скрыпты шовіністы.

2 чэрвеня...

Менск...

Захароўская...

«Orzeł»...» «Orzeł»... «Orzeł»...

Адзін... другі... трэці... десяты... двадцаты.!

Маўляў стая каршуноў носяцца над галавой пабожнаго люду абскубаныя польскія арлы.

Трапечуць крыллямі на пашарпаных ветрам пратэсах...

Хцівым, жэрлівым вокам выглядаюць сабе ахвяры.

У вокнах і на бальконах, на вытыканых рукамі працавітай беларускай «хлопкі» кабялцох, дзе над абразом Маткі Божай і Збавіцеля, дзе пад імі сядзяць зноў тыя самыя, падобныя да мокрай, абскубанай вароны, нахабныя, хцівыя польскія арлы.

— Што гэто?

— Дэмонстрацыя?

— Маніфэстацыя?—чаго?

— Для каго? Процiў каго?

— Не, гэто рэлігійная працэсія...

— Перароблєная палякамі у польскую маніфэстацыю.

Гэто абход сьвята Цела Божаго, замучанаго людзкай ніпраўдаю і адданаго наштарпанне кацдзюрамі драпежніка.

Гэто падмена рэлігіі на палітыку.

Гэто гяўз моральны гвалт, над нацыянальным пачуццём Беларускаго народу, учынены праз ашуканство, праз выкарыстанне яго рэлігійнасьці...

Гэто блюзнерство над рэлігіяй.

Гэто нічым ні вытлумачаны нідагляд духавенства, каторае у Дом Божы пушчае махляроў, выгнаных адтуль ужо адзін раз Тым, чыё Цела вынёсў з дому урочыстым паходам сьвяточна учціць беларускі каталіцкі люд.

А. Новадворскі.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН, 30/V. Яго Імпэратарская Вялікасьць гэрманскі Імпэратар паслаў кронпрынцу вось якую тэлеграму: Яго Імпэратарскай Высокасьці Кронпрынцу, генэралу ад інфантэрыі і Главнакамандуючаму Армейскай Группай Гэрманскаго Кронпрынца. Дзеля вялікіх усьпехау, дасьцігнутых у гэтых днях падчыненымі Табе Армейскай Группы адложнымі і выпытаннымі войскамі якая знаходзіцца пад Тваім камандаваннем, адараю Цябе зоркай Вялікаго камандора ордэна пануючаго дома Гогэнцолерна, з мечамі, і выказываю Табе па поваду гэтаго вялікаго і заслужанаго адлічыя мае сэрдэчныя пажаданні.

Вільгэльм.
J. R.

ЦУРЫХ, 31/V. Газэта «Найе Цурыхэр Цэйтунг» паведамляе з Буэнос-Айрэса: Урад прызнаў парадчыка пасольства, Дэнгофа, як паверанаго у справах Гэрманіі.

ЦУРЫХ, 31/V. Згодна паведамлення Гаваса, у Гішпаніі захварэло эпідэміей каля 8 мільёнаў чалавек. Каралю ўсё яшчэ ні здаровіцца. Дохтары апавешчалі, што хвароба выклікана катаральнымі бацыллами.

БЭРН, 1/VI. Учора Клемансо прыняў дэпутацыю соцыялістаў і гаварыў з ёй аб розных пытаннях, глаўнае тычучых ваеннаго становішча. Ен заявіў, што адмаўляецца ад абсуджэння пытання Кашэна і Брунэ аб ваенных апэрацыях і зробіць у аўторак належачую заяву у палаце.

ПАРЫЖ, 1/VI. Клемансо забараніў усякаго роду одпускі, за выключэннем выпадкаў хваробы.

БУКАРЭСТ, 31/V. А будучым ураджаю у Бэсарабіі, бэсарабскі міністр, Інкулет, паведаміў, што у Бэсарабіі у гэтым годзе куды болей аброблено як у звычайныя часы. Німа ні кроку нізасеянай агародпай зямлі. Віды на ураджай вельмі прыемлівыя.

Варшаускі унівэрсытэт. Лік запісаўшыхся на будучы сэмэстр у варшаўскім унівэрсытэці студэнтаў даходзіць усяго 2,220 чалавек. З іх—54,2% хрысьціян, і 45,8% еўрэяў.

РЫМ, 28/V. «Жыорнало д'Італія» паведамляе: Учора раніцай, калі усе цесніліся у царкві сьв. Злучэння, раптам раздаўся крык: «Ратуйцеся! на помач!» Натоўп, папоўняўшы царкву і паперць, апанавала вялікая паніка. У сьціску пагінуло 7 і ранено 120 чалавек. Разследаванне паказало, што крыкі былі пушчаны гістэрычнай кабетай, вар'яткай.

ЖЭНЭВА, 29/V. Як паведамляюць парыжскія часопісі, апрача ўзабнавіўшага сільнага абстрэлу, два разы былі трывогі дзеля лятупоў. Ліонская прэсса констатыруе адбурэнне сярод насялення, так як афіцыяльнае паведамленне лічыло, што германскія дальнабойныя арудзьзі зьнішчаны, але аправерджанне гэтаму было зроблено ворагам страшным чынам. Ваенны савет дзержаў Згоды аб'явіў салідарнасьць пад старшинствам прэзыдэнта.

Весткі з Расії

— Як паведамляе Балканскае Агенство, Плеханаў вінаваціцца у тым, што ён, са згоды Мілюкова, кіраўніка кадэтаў, падгатаўляў контр-рэвалюцыю. У яго пецярбурскім памешканьні быў зроблены обыск.

Плеханаў—кіраўнік правай соцыялістычнай партыі «Единство», называючай сябе соцыял-патрыатычнай, процю каторай крайнія соцыялісты вядуць вялікую барацьбу.

— МАСКВА, 28/V. Ад імяні расійскага ураду народны камісар па міжнародных справах, Чычэрын, паслаў французкаму ураду вось якое паведамленне. Заява французкага пасла Мулена у цяжкія часы, каторыя перажывае цяпер расійскі народ, ні можа памагчы у палажэнні адносін паміж Францыяй і Расіяй і ніцярпіма. Савецкі урад выказывае сваю цьвёрдую пэўнасьць што Мулен зараз жа будзе адкліканы.

— МАСКВА, 29/V. «Новая Жизнь» піша, што весткі аб новай згодзе паміж Японіяй і Кітаем, пакіраванай процу Германіі, трэба разумець як спробу нікаторых кол у Лёндане і Вашынгтоне, фарсіраваць здарэнні на Далёкім Усходзі. У Маскве у гэтай згодзі бачуць пагрозу Расії.

— «Ряз. Жизнь» пробуе падвесьці нікаторыя падрахункі а пагромах маёнткаў.

У Тульскай губ., напрыклад было зруйновано у працягі 1917 г. 180 маёнткаў поўнасьцю і 80 маёнт. часьцічна. У Рязанскай губ. за гэты час пацярпело ад пагромаў болей 430 м.

Пры гэтым, калі за першы месяц рэвалюцыі зруйнавано усяго шасьць эканомій, то найвялікшы лік пагромаў на першы месяц большавіцкаго пераварту, калі іх было 80.

Страты па Тульскай губ. лічацца прыблізіцельна каля 30 мільёнаў руб. Болей другіх пацярпеў Ефрэмоўскі павет, дзе маёнткі сьцерты і зьнішчаны так, што ад іх і знаку ні асталося. У Сымбірскай губ., прыблізіцельна, той самы абраз: працэнт зруйнаваных маёнткаў раўняецца двум трэцям усяго ліку маёнткаў у губэрні. У полымі згінуў хутар патомкаў Карамзіна, разграбавана Дзержавінская усадьба. Страты у Пэнзэнскай губэрні даходзяць 20 з лішкам мільёнаў, Хаўрус земляўласьнікаў лічыць, што да 1/I—1918 г. у Расії згінуло пры аграрных беспарадках на поўтара мільярда вартасьцей і каля 2 тысяч чалавек.

На беларускім шляху.

Загадчык труппаю «Першаго Тававарыства Беларускай Драмы і Камэдыі» Ф. Ждановіч звярнуўся у Народны Сакратарыят с дакладам аб прынацці пад апеку Народнаго Сакратарыяту беларускаго тэатру у поўным складзе, з інвентаром, касьцюміроўкай і інш. Народны Сакратарыят на гэто згодзіўся. Дэталі установы і развіцця Беларускаго тэатру на усей Беларусі павінна разьвіць камісія Народнаго Сакратарыяту пры учасьці прэдстаўнікоў тэатру і літэратуры.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У чырвоным крыжу, згодна вывешанаму за подпісью поўнамоцнаго заходнаго района прыказу ад 4-го па 10-е чэрвеня павінна быць зроблена рэгістрацыя сесьцер міласэрдзія, як знаходзячыхся на службе, так і адкамандзірованых у абшчыну абшчынскіх сесьцер міласэрдзія.

Асобы у форме сястры або чыны Р. О. К. К. са знакамі, ні маючыя пасьля 15 чэрвеня новых рэгістрацыйных картак, будуць затрымлівацца міліцыяй і караца судом.

На Троіцкім пляцу у панядзелак, 3 чэрвеня болей усяго было дроў:

сасновыя — 15—18 р. воз.
бярозавыя — 20—25 р. „
кіслае малако — 1 р. кв.
сьметана — 4½—6 р. кв.
граблей — 2 р. шт.
драбіна — 10 р. „
упраж (на 1 каня)—90 р.
абады — 60—70 р. пара.

Паверачная рэгістрацыя салдат у воінскаго начальніка ні вызначаецца вялікім наплывам, бо канечны срок 15 чэрвеня.

Штодзенная чарга некольні дзесяткоў чалавек.

Малы лік служачых упраўленскіх штатаў Л. Р. ж. д. с прычын ад'езда большасьці служачых у Маскву у раду камісарау па дэкрэцкія прыбаўкі. дайшоў да таго, што у хуткім часе будзе паднято пытанне а пераводзе сумм гэтай катэгорыі з Масквы акупаваным уласьцям, дзеля раздачы па назначэнню.

Цэны за мейсцы на Старажоўскім праваслаўным магільніку за апошні час вельмі падняліся (замест 5 10 руб. цяпер 50 р. і больш), па ініцыятыве нікаторых ад парахвіян, у хуткім часе мае быць урэгулірована праз епархіяльныя уласьці.

Тое самае і плата за трэба—іспраўленне і за абкладку магіл.

Абмен царскіх грошай на акупацыйныя за апошнія дні у «Вэксэльштубэ» прыняў вялікія размеры: прыкмечаецца доугая чарга перад двума окнамі.

«Керэнкі» 20 і 40 руб. вартасьці, як кажа абвестка, у абмен ні прыймаюцца.

За царскія рублі даецца па ранейшаму—за 1 р.—1 р. 25 к. нямец.

Банкірскія жэ канторы даюць цяпер за 1 р. царскіх—1 р. 24 акуп.

Выдача гэрбаты па бонах уводзіцца нямецкімі уладамі у бягучым месяцы, бо за апошні час гэты прадукт с—пад палы прадаецца па 40 р. фунт.

С пачатку запасы гэрбаты будуць рэквізавацца, так як былі рэквізаваны хлеб, цукер і другія прадукты.

У ліку бліжэйшых мерапрыяцій, намечаных новым месьскім галавою Хржонстоўскім, есьць так сама асобая, як ен казау, забота аб абезпечэнні месьскіх установаў прадуктамі першай патрэбнасьці.

Нідахват сумм губ. Казначэйства, патрэбных для выплаты па трэбавацельным ведамасьцям пэнсіі за май казенным установам, у вялікім стопню.

Паступіло бандэрольнаго збору з запалак на 105,000 руб.

Канцылярыя старшаго натарыуса, эвакуіраваная у 1915 г. у Маскву, мае зноу пачаць сваю працу у бягучым месяцы.

Патрэбнасьць у гэтым установу вялікая бо усе крэпастныя акты, зробленыя малодшымі натарыусамі, лежаць без руху—німа каму пацьверджаць.

У пасядзэнні месьскай думы, Рэшэно выбары членаў управы, замест адказаўшыхся Зальманова і Фрумкіна-Віхман, рабіць заутра, 6 чэрвеня.

Начальнік Л. Р. ж. д. Зеля тэлеграмай па лініі паведаміў, што яго уласьць, як главы дарогі, фактычна перайшла да нямецкіх ж. д. уласьцей да віленскаго абласнаго упраўлення № 5, і што ен, Зеля, часова астаецца тут толькі да канца ліквідацыі.

Паміж іншым: ад'езд Л. Р. служачых у Маскву у раду камісарау па атрымання дэкрэцкіх дабавак, да таго зьменшу упраўленскія штаты (ад глаўнай бухгалтэрыі, напрыклад, нічога ні асталося), што прыдзецца наняць часьць пэрсаналу спэцыяльна дзеля аканчання дзікідацыі...

Афіцыяльнае паведамленне нямецкаго вярхоўнаг камандавання за 3 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Руирэхта.

Часамі ажыўляючыяся артылерыйскія біты, варожы атакі захадней Вэйеля і на поўначы р. Ліс былі адбіты.

Група арміяу Германскаго Кронпрынца.

Дзеля дапаўнення французкіх і ангельскіх армейскі корпусаў, разбітых нашымі атакамі і дзеля падтрыманн шмат пацярпеўшых дывізіяў, раньш пасьпешно данаўняўшыес суседзкімі арміямі падвезены і уступілі у біту новыя фран цузкія рэзэрвы, быўшыя раней на другіх, далёка адстоя чых фронтах.

На поўначы ад Энь яны безуспешно пробавалі утры маць за сабою указаныя ім пазыцыі. Мы выбілі іх у сільным бою з акопаў па лініі Мулэн-су-Тувам—Сэнт Крыстоф—Вангр. На поўдні Суассона быў узяты Шодэн. Мы працісьнуліся атакай праз Саў'ер да ўсходняго берагу лясоў Віллер—Котэрэ. На поўдні ракі Урк непрыяцель рабіў сільныя атакі, яны былі адбіты з цяжкімі для яго стратамі. З Куршан і Монт'ерам мы заўладалі мейсцам і занялі узвыш кі захадней замчышча Т'ерры.

На Марне, паміж Марнай і Рэймсам становішчо бе перамен.

Жалезныя дарогі, занятыя перавозкай войск да фронту, былі удачліва атакованы нашымі ўваздушнымі бомбамі. Мы зьбілі 31 варожы аэроплян. Лейтэнант Менкгоф зрабіў сваю 29 і 30, а лейтэнанты Левенгардт і Уэт сваі 25 ўваздушныя перамогі.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Програма месьскаго войта. Супрацоунік «М. Е.» меў размову з новым месьскім войтам, п. С. Хржонстоўскім, каторы сказау аб сваей праграме: «Першым маім заданнем будзе улепшэнне месьскіх фінансау: зьменьшэнне як можна выдаткау, і павялічэнне даходау. Другім будзе праца для безработных. Думаю прасіць нямецкія улады аб пажычца месту на далейшае брукаванне вуліц, будоулю новай водаправоднай вежы, у якой чуецца вялікая патрэба і г. д.

Новы войт думае гэтак сама патрэбаваць устроіць у Менску, за дапамогай нямецкіх уладау, электрычны трамвай, прэдпрыемство сулячае выгоды насяленню, також і месту. У канцы будзе зьвернута пільная увага на своечасную загатоуку для меставых установ рачай першай патрэбы, у якіх цяпер пачуваецца вялікая лістача.

Весткі с краю.

ВІЛЬНЯ. **Паварот праваслаунаго архіепіскопа.** У тым нумары мы перадрукавалі заметку «Lituvos Aidas аб паварочы «віленскаго архіепіскапа Ціхана». Вестка гэта не зусім правільная. Справа ў тым, што архіепіскап Ціхан выбран за расейскаго патрыарха і жыве ў Маскве, скуль і ні думаў варочацца ў Вільню на старое месца. Відаць, гутарка йдзе аб павароце ковенскаго архіепіскапа Елеўферыя, ці мо нованазначанаго на становішчэ віленскаго архіепіскапа.

— **Госьці з Нямеччыны** 27-го мая праездам с Коўны тут задзержаліся дзеля агляду места прускі міністэр унутраных спраў Друс, міністэр фінансаў Гэркт і памоцнік статс-сакратара Буш. Яны аглядалі места разам з начальнікам упраўлення Об Ост, ф. Фалькэнгаўзэнам. Між іншым, яны былі і на выстаўцы віленскіх дамоў працы. У 11 гадз. вечар яны паехалі далей.

— **Тэрмін вэксэлеў і чэкаў** у нашым краю перанесен с 30 чэрвеня на 30 верасьня 1918 году.

— **Напамінанне.** Начальнік упраўлення Літвы іщчэ раз папярэджывае, што курыць у лесі, а такжа раскладаць цяпло і выпаліваць шкодные травы на пожнях і ў садох забаронено. У часе лясных і іншых пажараў жыхары на жаданне ўласьці павінны памагаць тушыць іх.

ГОРАДНЯ. На другі дзень Сёмухі тутэйшая жыдоўская грамада наладзіла «дзень кветкі» на карысьць бедных. Чыстаго даходу сабралі 1530 м. 50 фэн.

«Grodn. Ztg.» наказывае, што так званые «царскіе» рублі будуць прынімаць па курсу 1 м. 25 ф. толькі іщчэ да 15 чэрвеня. Ці пасьля гэтаго дня будуць наагул прынімаць «царскіе» рублі і па якім курсе, гэта залежыць ад далейшаго ходу здарэнняў у Расії.

ДЗЬВІНСК. У суботу перад Сёмухай тут узьняўся вялізарны пажар, ад каторага згарало каля 30 дамоў. Больш за 50 сямей асталіся пад голым небам.

«Гоман».

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтва **Т-ва «Заранка».**

Друкарня Л. А. Грыйблята.